## Слоўнік

шаповал — *шапавал*
изделие — *выраб*
Дрибинщина — *Дрыбіншчына*
изготовление — *выраб*
валяние — *валенне*

Запішыце па-беларуску сказы, у якіх ёсць указальныя займеннікі.

## § 70. Азначальныя займеннікі

**442.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Герб і сцяг лічацца ва **ўсіх** краінах **самымі** важнымі сімваламі народа. Яны адлюстроўваюць не **любую** сімволіку, а толькі ўласцівую ім. **Усе** сцягі і гербы павінны істотна адрозніваца ад **іншых** падобных сімвалаў. **Кожная** дэталь сцяга і герба нашай дзяржавы дае наглядныя і ў той жа час важныя звесткі пра нашу краіну, пра **сам** народ *(Паводле Э. Сурначова)*.

Калі адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Беларусі? Вызначце род, лік і склон выдзеленых займеннікаў.

Да **азначальных** адносяцца займеннікі ***сам (сама, само, самі), самы (самая, самае, самыя), увесь (уся, усё, усе), усякі (усякая, усякае, усякія), усялякі (усялякая, усялякае, усялякія), кожны (кожная, кожнае, кожныя), любы́ (любáя, любóе, любы́я), іншы (іншая, іншае, іншыя)***.

Усе азначальныя займеннікі змяняюцца, як прыметнікі, па ліках, склонах і родах (у адзіночным ліку).

**443.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

***змáлку***




Само не гаворыць,
Ды ўсім адгукнецца,
Наш голас паўторыць,
Як мы, засмяецца.
*М. Пазнякоў.*

У яе, у гэткай дáмы,
Усё жыццё[ф] на футры плямы,
Вушы змалку з кутасамі.
Хто яна? Скажыце самі.
*Н. Сторажава.*

Знайдзіце ў тэкстах азначальныя займеннікі. Вызначце, у якіх формах яны ўжыты.


Правообладатель Национальный институт образования

Займеннік ***сам*** указвае на ўтваральніка дзеяння або падкрэслівае важнасць асобы: *Не спадзявайся на пракокаў — будзь **сам** прарокам, чалавек* (А. Бачыла).

Займеннік ***самы*** ўказвае, да якой мяжы можа праяўляцца дзеянне, ці служыць для ўтварэння складанай формы найвышэйшай ступені параўнання прыметніка: *Свеціць, як сонца, ад **самай** калыскі вобраз любімы, родны і блізкі. Маміна імя **самае** лепшае, маміна слова найдаражэйшае* (М. Хведаровіч).

**444.** Прачытайце табліцу. Вызначце, якіх форм не хапае ў ёй.

| Скланенне займеннікаў *сам, самы* | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Склон | Адзіночны лік | | | | | |
| | *сам* | | | *самы* | | |
| | м. р. | н. р. | ж. р. | м. р. | н. р. | ж. р. |
| Н. | *сам*□ | *сам*[о] | *сам*[а] | *сам*[ы] | *сам*[ае] | *сам*[ая] |
| Р. | *сам*[ога] | | *сам*[ой] *(-ое)* | *сам*[ага] | | *сам*[ай] *(-ае)* |
| Д. | *сам*[ому] | | *сам*[ой] | *сам*[аму] | | *сам*[ай] |
| В. | *сам*[ога] | *сам*[о] | *сам*[у] | як Н. або Р. | | *сам*[ую] |
| Т. | *сам*[ім] | | *сам*[ой] *(-ою)* | *сам*[ым] | | *сам*[ай] *(-аю)* |
| М. | *(пры) сам*[ім] | | *(пры) сам*[ой] | *(пры) сам*[ым] | | *(пры) сам*[ай] |

Праскланяйце займеннікі *сам* і *самы* ў множным ліку. Зрабіце вывад пра асаблівасці змянення.

**445.** Разгледзьце ілюстрацыі да беларускіх казак. Складзіце сказы па малюнках, выкарыстоўваючы займеннікі *сам, сама, само, самі*.













- Як утварыліся прыметнікі ў назвах «Зайкава хатка», «Бацькаў дар»?



Правообладатель Национальный институт образования

*Самóму сабе, самóга сябе, на сáмай справе.*

**446.** Прачытайце табліцу. Ад чаго залежаць канчаткі займеннікаў?

| Склон | Скланенне займеннікаў *увесь, кожны* | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *увесь* | | | *кожны* | | |
| | м. р. | н. р. | ж. р. | м. р. | н. р. | ж. р. |
| Н. | *увесь*□ | *ус***ё** | *ус***я** | *кожн***ы** | *кожн***ае** | *кожн***ая** |
| Р. | *ус***яго** | | *ус***ёй** *(-яе)* | *кожн***ага** | | *кожн***ай** *(-ае)* |
| Д. | *ус***яму** | | *ус***ёй** | *кожн***аму** | | *кожн***ай** |
| В. | як Н. ці Р. | *ус***ё** | *ус***ю** | як Н. ці Р. | *кожн***ае** | *кожн***ую** |
| Т. | *ус***ім** | | *ус***ёй** *(-ёю)* | *кожн***ым** | | *кожн***ай** *(-аю)* |
| М. | *(пры) ус***ім** | | *(пры) ус***ёй** | *(пры) кожн***ым** | | *(пры) кожн***ай** |

Якія канчаткі маюць займеннікі *ўсякі, усялякі* і *любы* ва ўскосных склонах?

**447.** Прачытайце тэкст, ужываючы азначальныя займеннікі ў патрэбнай форме. Ці можна аднесці тэкст да апісання?

Мядзведзь вядомы *(кожны)* чалавеку. Усе ведаюць і азначэнне *(сам)* назвы. Мядзведзь — ‘той, хто ведае мёд’. Раней к..салапы быў *(самы)* звычайным зверам. Па *(увесь)* г..радах і вёсках сярэдн.. вечнай Беларусі хадзілі павадыры* з др..сіраванымі м..дзведзямі і забаўлялі людзей. Сёння мядзведзь[ф] занесены ў Чырвоную кнігу. Але яго можна ўбачыць у *(любы)* цыркум[м] *(Паводле Г. Аўласенкі)*.

Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

**448.** Спішыце сказы, устаўляючы замест кропак займеннікі *сам* або *самы*. Вызначце, у якой форме яны ўжыты, і растлумачце іх значэнні.

1. А падручнік ... лепшы — гэта кніга Белавежы *(В. Коўтун)*. 2. ... узлятае на далонь сініца, аб шчасці[ф] будзем з ёю гаварыць *(Т. Крумплеўская)*. 3. Стаіць каля ... ракі, глядзіцца ў люстэрка ракіта* *(Х. Гурыновіч)*. 4. Старайся іншых зразумець, тады сябе ..., можа, зразумееш *(Р. Барадулін)*.



Правообладатель Национальный институт образования